Касцёл Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса і св. Язафата Мучаніка ў Заневічах

Аўтар: Антон Шыдлоўскі
17.09.2011 03:00



Дэканат Вялікая Бераставіца Касцёл пад падвойным тытулам Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса і св. Язафата Мучаніка пабудаваны 2 кіламетры на ўсход ад вёскі Заневічы (некалі яна была шляхецкай аколіцай), на могілках. Святыня з атынкаванай цэглы ў стылі неакласіцызму была ўзведзена, паводле дадзеных, у 1917 г. на сродкі пана Бажэнцкага паводле праекта, распрацаванага ў 1908 г. Магчыма, святыня была пабудавана ў першай палове XIX ст. Пасля паўстання 1863 г. яна была зачынена, набажэнствы аднавіліся толькі ў 1917г. Гэта пацвярджаецца і датай на крапідле, якое знаходзіцца ў святыні: “1854 год”.

З часам фундатар быў пахаваны ў сваёй святыні. Яго жонка Цэліна (1833 – 1913 гг.) і дачка Ядзвіга (1863 – 1906 гг.) пераехалі ў Рым, дзе сталі заснавальніцамі новай манаскай супольнасці Сясцёр Змёртвыхпаўстання Пана Езуса (Змёртвыхпаўстанак). Абе-дзве пахаваны ў Кентах пад Кракавам, у галоўным доме супольнасці. † У міжваеннае дваццацігоддзе Зане--вічы сталі цэнтрам парафіі нова--ўтворанага дэканата Лунна. Першым пробашчам у ім стаў кс. Хлявінскі. Перад Другой сусветной вайной колькасць вернікаў складала тут амаль 1000 чалавек. Да парафіі належала таксама капліца ў маёнтку Абрэмшчызна. Упершыню яна ўзгадваецца ў другой палове XIX ст. як “араторыя” ад індурскай парафіі. На пачатку XX ст. гэтая хатняя капліца дзейнічала ўжо ад занявіцкай парафіі.

Першым пробашчам заснаванай у 1917 г. занявіцкай парафіі стаў кс. Юзаф Бяляўскі. У 1918 – 1924 гг. пробашчам быў кс. Эдмунд Хлявінскі, затым кс. Антоній Аўдыцкі (1924 – 1932 гг.), а з 1932 па 1939 г. – кс. Нікадзім Пахалко, які на пачатку вайны выехаў у Літву. Праз два месяцы ў парафію прыехаў кс. Юзаф Мацяеўскі.

Касцёл Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса і св. Язафата Мучаніка ў Заневічах

Аўтар: Антон Шыдлоўскі
17.09.2011 03:00

